**В.Д.Старычонак**

## Гукавыя субстантыўныя намінацыі ў беларускай мове

Развіццё другасных субстантыўных намінацый ажыццяўляецца ў напрамку трох асноўных мадэлей: а) гукі, што ўтвараюцца чалавекам → гукі, утваральнікам якіх з’яўляюцца жывёлы, птушкі, дрэвы, расліны, водная плынь, вецер і інш.; б) гукі, што ўтвараюцца жывёламі і птушкамі → гукі, утваральнікам якіх з’яўляюцца людзі і артэфакты (як правіла, транспартныя сродкі, узбраенне); в) гукі, звязаныя з выкананнем музычных твораў → гукі, што ўтвараюцца прадстаўнікамі жывёльнага і расліннага свету.

Першая мадэль мае антрапамарфічны характар, і пераасэнсаванні ў ёй ажыццяўляюцца ў кірунку ад гукаў чалавека на падобныя ў нечым шум дрэў (і іх лістоты) і ветру, гул грому, журчанне вады, усплёск хваль, птушыную гаману і інш. У слоўніках літаратурнай мовы засведчаны субстантывы ***галашэнне*** (*галашэнне чаек, галашэнне ветру, галашэнне палазоў*), ***гамонка*** (*птушыная гамонка, гамонка басістых чмялёў, гамонка хваль і ручаін, гамонку лясоў*), ***гоман*** (*гоман шумлівых хваль, гоман белавежскіх дрэў, гоман птушак*), ***голас*** (*галасы лясоў і гаёў, злыя галасы вятроў, галасы птушак*), ***енк*** (*енк завеі*), ***крык*** (*ненажэрны крык гракоў*), ***кугаканне*** (*кугаканне савы*), ***літанне*** (*раннія літанні салаўёў*), ***перашэпты*** (*перашэпты ніў, перашэпты хваль з асакой*), ***посвіст*** (*посвіст ветру*), ***рогат*** (*рогат бур, акіяна насмешлівы рогат*), ***стогн*** (*далёкія стогны грому, стогны вялікай ракі*), ***уздых*** (*уздыхі лазовых хмызнякоў, уздыхі завірухі*), *уздыханне* (*уздыханне ветру, уздыханне мора*), ***усхліп*** (*усхліпы суровых завей, усхліп ласкавай хвалі*), ***шаптанне*** (*крынічнае шаптанне, шаптанне чароту*), ***шэпт*** (*шэпт бяроз, лісцвяны шэпт, шэпт хваляў, шэпт снегу*).

Той жа кірунак сэнсавага развіцця назіраецца ў структурах наступных аказіянальных метафар:

***Балбатня***: *Калі мы сустрэліся з табой, І вясельных чарак перазвон Чулі ў салаўінай балбатні*. (Х.Жычка).

***Гамана***: *Гамана сястрыц-зязюль.* (Я.Янішчыц); *Мяне дагнала клёнаў гамана.* (У.Марук).

***Гуканне***: *Я прахапіўся ад гукання пеўняў.* (Ф.Баторын).

***Дыспут***: *Шумны дыспут лісця.* (М.Кусянкоў).

***Лаянка***: *Сарокі лаянкай абразілі Забыты, некратуты свет.* (В.Лукша).

***Літанне***: *Яшчэ больш гучна, яшчэ з большым натхненнем правяць салаўі раннія літанні.* (Я.Колас).

***Малебен:*** *І сядзе на елцы высокай касач, свае адчытае малебны...* (У.Дубоўка).

***Маленне***: *Трубяць алені ў шлюбным маленні, І цецярук-лапатун балбоча.* (Р.Барадулін); *У вячэрнім маленні званоў – Учарашніх вякоў перазовы.* (Л.Пранчак).

***Малітва***: *Сосны і вязы, дубы і асіны Вокала возера вартай пасталі, Долу ківаюць паклоны нямыя, Небу малітву таемную твораць.* (Я.Купала).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Плач***: *І восень сцюдзёная з ветрам і плачам.* (У.Дубоўка); *Ціхі плач бяроз.* (В.Вабішчэвіч)

***Прычытанне***: *І раптам з адвечнага мора імглы завітвае вецер – сляпы чарнакніжнік – прычытаннем асіны і енкам пілы.* (В.Маракоў).

***Смех***: *Смех блакітных васілёчкаў У межах росных збажыны.* (Я.Колас); *Журблівы смех ручаінкі.* (М.Лынькоў); *Гром-смех пракаціўся па нябёсах.* (Л.Дайнека); *Над сінім лесам, шэрым полем задорны смех ліе вясна.* (В.Маракоў).

***Трызненне***: *Трызненне ветру і бярозы* (В.Слінко).

Менш распаўсюджанай лічыцца зоанімічная мадэль, у якой гукі жывёл і птушак атаясамліваюцца з гукамі чалавека. У працэс метафарызацыі ўключаюцца ўзуальныя субстантывы *шчабятанне, шчэбет (шчабяток), скуголенне, кудахтанне, іржанне, роў і брэх (аказ.):* ***Шчабятанне*** *Рыткі здавалася мне папросту дзіўным і смешным.* (А.Крэйдзіч), *Яна ўстрымалася ад пустога* ***шчабятання*** *і моўчкі села на пянёк, уткнуўшы нос у кніжку.* (М.Машара); *Мне па душы жончын* ***шчэбет*** *ды рулады салаўя!* (А.Масарэнка); ***Шчабяток*** *дзіцячы будучай маёй каханай.* (М.Мятліцкі); ***Скуголенне*** *злой снежнай мяцеліцы.* (Л.Родзевіч); *Наша* ***кудахтанне*** *на ўвесь пакой ужо надакучыла.* (М.Лынькоў); *Тут ужо не смех, а проста* ***іржанне*** *пракацілася па класе.* (А.Чарнышэвіч); *«От дак жаніх!» – чулася адтуль* ***іржанне***. (І.Мележ).

Гукі жывёл часам успрымаюцца разам з пэўнымі матэрыяльнымі аб’ектамі, якія ўтвараюць такія гукі. У такіх выпадках у сферы-мішэні метафарычнай канцэптуалізацыі аказваецца гучанне баявых машын (танкаў, грузавікоў, самалётаў), зброі (кулямётаў, рэвальвераў), транспартных сродкаў, розных артэфактаў: *Цемру жудаснай вайны, Крыві, атрутных газаў і фугасаў,* ***Іржання*** *й кашлю картавых танкаў... Усю тую цемру Прарэзала святлом нязмерным веры.* (Я.Купала); *У вушы раптам уварваўся* ***роў*** *грузавіка.* (А.Дзятлаў); *Неўзабаве ён пачуў* ***роў*** *самалёта, а потым сухі трэск кулямётаў.* (І.Гурскі); *Ацалелыя яблыні Помняць звяглы Кулямётаў зганчэлы* ***брэх***. (Р.Барадулін); *У кулямётаў захлёбісты* ***брэх***. (В.Бутрым); *Мы ідзем праз рэвальверны* ***брэх****, Як паэт калісьці гаварыў.* (Х.Жычка); *Масляністы* ***клёкат*** *сялянскіх вазоў чуўся там недзе, на вёсцы.* (М.Зарэцкі); *У некалькіх дварах гукі гэтыя перабіваў чысты, працавіты* ***клёкат*** *жалеза аб жалеза – касцы ладзілі, адбівалі малаткамі косы.* (І.Мележ); *Глухім водгукам даносілася* ***стракатанне*** *і гул малатарні з недалёкай вёскі.* (П.Пестрак); *Рытмічнае* ***стракатанне*** *электрастанцыі.* (М.Клімковіч).

У трэцяй мадэлі (музычнай) у якасці сферы-донара выступаюць гукі, звязаныя з выкананнем музычных твораў і самі музычныя творы. Меладычнасць і музыкальнасць гукаў, выкананне пэўных мелодый, песень і іншых музычных твораў пераносяцца на нечым падобныя спевы птушак, шум ветру, шэлест лістоты і інш. У якасці крыніцы матывацыі для выражэння такіх гукаў у літаратурнай мове выступаюць першасныя ЛСВ полісемантаў ***музыка*** *(задуменная музыка лесу, музыку родных лясоў, музыка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*світання, лівень асенняе музыкі),* ***песня*** *(песня жаваранка, песня палёў, самотная песня вятроў),* ***спеў*** *(вясёлы спеў вады ў руччах, спевы рачной вады, птушыны спеў, спеў вятроў),* ***спяванне*** *(салаўінае спяванне).* Колькасць такога роду аказіянальных ЛСВ у некалькі разоў перавышае колькасць узуальных ЛСВ і прадстаўлена наступнымі намінацыямі:

**Гімн** ‘урачысты, хвалебны музычны твор’. *Ранку гімн спявае пеўнік.* (М.Скобла); *Звіняць шчабятушкі – Свой гімн пяюць птушкі.* (Я. Купала); *Гімн чыстаму каханню заспявалі званчэй чараты.* (Р.Мурашка); *Шумець век векам будуць хвоі І гімны славы вам складаць.* (Я. Колас); *Весні гімн вадаспада Стаў як вешчая рада.* (М.Віняцкі); *Гімн вясны пяе дрэва, птушка і раса.* (М.Мятліцкі).

**Калыханка** ‘песня, якую спяваюць, калі калышуць дзіця’. *Дарэмна пяеш калыханку, зіма.* (А. Вялюгін); *З прыродай жорсткай біўся [чалавек]з веку ў век Пад Прыпяці глухую калыханку.* (У. Верамейчык).

**Кантата** ‘буйны музычны твор; харавая песня’. *І слухаю праз шапаценне лісця… кантату ахрыплага пеўня.* (М.Танк).

**Канцэрт** ‘публічнае выкананне музычных і іншых твораў’. *І салаўі па вечарах Даюць свае канцэрты.* (М.Танк); *Птушыны канцэрт не сціхае ў лугах*. (М.Лупсякоў).

**Найгрыш** ‘народная інструментальная мелодыя’. *Ну, вядома ж, я не мог праспаць... Гэты цвыркуновы найгрышы сольны...* (Н.Гілевіч).

**Накцюрн** ‘невялікі музычны (пераважна фартэп’янны) твор лірычнага характару’. *У запечку знаёмы накцюрн цвіркуноў.* (М.Танк); *Сумуе снег, разрумзаўся лядок, а павадак зайграў накцюрн сустрэчы...* (Р.Баравікова).

**Напеў** ‘мелодыя, матыў’. *З тых дзён, поўных чараў казкі, Пад напеў дарожных лоз, Стаў я песняром сялянскім Гэтых сцежак і бяроз*. (М.Танк); *Напевы вясновай дубровы.* (А.Дзеружынскі); *Лавілі мы ўсходняга ветру напеў.* (М.Танк); *Тады напеў балотнай жабы Ахрысцяць небывалай одай.* (М.Танк); *Веснавы загадкавы напеў.* (Н.Гальпяровіч).

**Нота** ‘асобны гук пэўнай вышыні ў музыцы і спевах’. *Колькі назойлівых нотаў Дождж паўтараў ачмурэла.* (І.Тарасава).

**Паланэз** ‘урачысты бальны танец і музычны твор у рытме гэтага танца’. *Журавы спяваюць паланэз.* (А.Сыс); *Паланэз вяртання агніста найграе на чарацінах пругкіх беспрытульны вецер.* (Р.Малахоўскі).

**Рапсодыя** ‘віртуозны інструментальны твор на тэмы народных песень і танцаў’. *За акном рапсодыя асенняя.* (Д.Пятровіч); *Цяпер сама з сабой у згодзе я, І ваяўнічы дух астыў, Мая асенняя рапсодыя На веснавы гучыць матыў.* (Н.Маеўская); *Палессе! Кожная лясная рэчка твая – драмлівы рэчытатыў ліры*. (У.Караткевіч).

**Рэквіем** ‘музычны твор жалобнага характару’. *І вятры з журавамі Рэквіем пратрубілі.* (М.Танк); *Зайграла восень рэквіем З ліста, Што павуцінку навісу трымае.* (У.Скарынкін); *У просіні над вежамі, над рэкамі жураўліны рэквіем*. (А.Вярцінскі); *Лебядзіны рэквіем пачула наваколле.* (В.Гардзей).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Рэчытатыў** ‘напеўная размова ў вакальна-музычным творы’. *І вось над намі сосны хорам Свой пачалі рэчытатыў.* (М.Танк).

**Саната** ‘музычны твор з трох або чатырох частак’. *Скрыпічны ключ зямлі збірае спакваля ў санату ручаёў дажджынкі-ноты.* (В.Сахарчук).

**Сімфонія** ‘вялікі музычны твор для аркестра’. *Мінск устае ў сімфоніій гудкоў.* (М.Танк); *Атуліў нас лем святлом зялёным І сімфоніяй гаючай цішыні.* (З.Прыгодзіч).

**Сола** ‘выкананне твора адным музыкантам, спеваком’. *Чулася птушкі світальнай сола.* (В.Гардзей); *Начное сола майстра салаўя На золаку птушыны хор змяняе.* (П.Саковіч).

**Фантазія** ‘музычны твор свабоднай формы, імправізацыйнага характару’. *Пад сто фантазій сівера І пад дажджу авацыі Кахання вочы сінія Мяне ніякавацілі.* (В.Стрыжак).

**Частушка** ‘кароткая песня жартаўлівага або сатырычнага зместу, прыпеўка’. *Пад сасновыя частушкі п’яны вецер завірнуў.* (М.Танк).

У працэс метафарызацыі могуць уключацца найменні нізкіх мужчынскіх (жаночых) галасоў: *Гучаць **альты**, пяюць **басы** – Чаруюць музыкай лясы.* (В.Сахарчук); *І чутны старых віроў **басы**, Бо віры, як жорны, круціць Нёман.* (К.Жук); *Цягнікі … пераклікаліся гулка **басам** густым.* (М.Танк).

Часам гукавыя найменні адначасова выкарыстоўваюцца ў невялікіх тэкставых фрагментах і тым самым ствараюць яскравы гукавы вобраз. Параўн.: *Ах, як нам блізка і знаёма З гадоў дзіцячых, маладых – Вясновых рэчак дзіўны **гоман**, Дажджоў **цымбалы**, **бубны грому**, **Жалейкі** птушак паміж іх.* (П.Броўка); *Снуючыся высока ў небе, раняла птушка мяккія, ласкавыя **мелодыі**, сатканыя са **звону** срэбраных струн, з **булькання** лясных ручайкоў, з **зумкання** пчаліных крылцаў, **шолаху** красак.* (Я.Колас); ***Траў** заігралі зялёныя **гуслі**, **струны** сцяблін і **цымбалы** расіцы.* (М.Калачынскі).

У невялічкім паэтычным дыскурсе Уладзіміра Мазго за кошт арганічнага спалучэння дзеясловаў *спяваць, іграць, гучаць, чараваць* з субстантыўнымі метафарамі *паланэз, альт, бас, музыка* ўзнаўляецца дынамічны малюнак веснавога абуджэння лесу:

Падорыць мне вясновы лес
Свой непаўторны **паланэз**.
**Спявае** гай,
**Іграе** бор –
Усім вятрам наперакор.
**Гучаць альты, пяюць басы** –
Чаруюць **музыкай** лясы.

У вершы Васіля Сахарчука «Асенні дождж» створаны выразны малюнак дажджу з яго музыкай, клавіятурай траў, струнамі галля, званочкамі лістоты, скрыпкамі клёнаў і бубнамі парасонаў:

Абагаўляю **музыку дажджу**,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на мову слоў яе перакладаю,
услухваюся ў дождж,
стаіўшыся, гляджу,
як **музыка** плыве з-за небакраю.

З **клавіятуры траў**,
счарнелых **струн галля**
і са **званочкаў** соннае **лістоты**
скрыпічны **ключ зямлі**
збірае спакваля
ў **санату ручаёў**
**дажджынкі-ноты**.

Чаруе цішыню,
іскрыцца і пяе
**музыка-дождж** на жоўтых **скрыпках клёнаў**.
І слухаючы дождж,
са схаваў дастае
зямля тугія **бубны парасонаў**.

Тэматычная скіраванасць першасных ЛСВ полісемантаў і іх метафарычнае развіццё залежыць ад той ці іншай ступені праяўлення гучання. Так, вялікая сіла, працягласць, узмоцненасць гучання гукаў жывой прыроды атаясамліваюцца з авацыяй, кананадай, сваркай, вэрхалам, гармідарам, лямантам: *Лістабой аглушае папар раскацістай хваляй асенніх* ***авацый***. (Э.Акулін); *Ціха! Гучыць* ***кананада*** *Птушыных галасоў...* (М.Башлакоў); *Нада мной бушуе грому* ***кананада***. (К.Буйло); *На старой бярозе штосьці не падзялілі, ўсчапілі* ***сварку*** *вароны.* (І.Аношкін); *Ясень дрыжыць пад дажджом, Слухае* ***сварку*** *маланак.* (С.Чыгрын); *У безупыннай* ***сварцы*** *чайкі б'юцца.* (Р.Малахоўскі); *А на узгорку лысым* ***гандаль*** *вераб'іны.* (І.Лосік); *Узнялі цэлы* ***вэрхал*** *шпакі ў скверыку.* (І.Аношкін); *Птушыны* ***вэрхал*** *быў на азёрах і балотах*. (Л.Дайнека); ***Гармідар*** *птушак у гаі хавае гук шчымлівай скрухі.* (В.Тарас); *Але мінула з паўгадзіны, а вароны і не думалі спыняць* ***лямант***. (А.Якімовіч).

Найменні *казка, роздум, пошум, веча* аказваюцца ў рэцыпіентнай зоне ціхіх, не зусім выразных гукаў: *Ціха калосікі баялі* ***казкі***. (А.Гурло); *Пад неба ўзносяць журавы І пошум трапяткі бярозы, І дуба* ***роздум*** *векавы.* (М.Стральцоў); *Наўкол паўсталі таўшчэзныя хвоі, іх ціхі, цягучы* ***пошум*** *плыў угары.*(В.Быкаў); *Апошні раз удзячна гляну На заінелую паляну, дзе дрэў сівых аціхла* ***веча*** *І ярка полымя трапеча.* (У.Скарынкін).

Градацыю гукаў з паслядоўным павышэннем сілы гучнасці можна прадэманстраваць у выглядзе наступнай шкалы гучнасці, дзе лічбамі абазначаны наступныя гукавыя метафары: *1 – роздум; 2 – уздыханне; 3 – трызненне, 4 – шэпт; 5 – пошум; 6 – перашэпт; 7 – гаварок; 8 – калыханка; 9 – напеў; 10 – найгрыш; 11 – маленне; 12 – літанне; 13 – усхліп; 14– размова; 15 – гамонка; 16 – балбатня; 17 – гоман; 18 – енк; 19 – спеў; 20 – плач; 21 – прычытанне; 22 – стогн; 23 – брэх; 24 – сварка; 25 – вэрхал; 26 –*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

*гармідар; 27 – рогат; 28 – іржанне; 29 – роў: 30 – авацыя; 31 –* кананада (Гл. дыяграму. 6.1.1).




**Дыяграма 6.1.1 – Градацыя гукавых намінацый**

Сярод гукавых метафар у асобную групу вылучаюцца маўленчыя метафары, якія ў сваёй большасці характарызуюць працэс маўлення, яго тон, гучнасць, рытм, інтанацыю, а таксама манеру гаварэння. У якасці базы для ўтварэння такіх метафар часцей за ўсё выступаюць найменні, звязаныя з патокам вады (ручаём, струменем, вірам, вадаспадам, каскадам). У працэсе метафарызацыі слоў гэтай тэматычнай групы могуць актуалізавацца дадатковыя семы 'імклівасць, хуткасць', 'бесперапыннасць': *У прастор вылятаалі* ***ручаіны*** *пявучых* ***слоў*** (К.Чорны); *Ліліся* ***радкоў ручаіны*** *І ўздыхі душы ўперамеж.* (М.Калачынскі); *Цячэ* ***прамоў струмень****, ракоча гаварыльня.* (А.Звонак); *Пакуль бруяцца* ***слоў віры*** *і думкам цесна на паперы, прашу цябе, свяча, гары, ахоўвай мой пакойчык шэры.* (С.Давідовіч); *Міраслаў прывыкаў да Вадзіма, да штодзённых прагулак, да* ***вадаспаду слоў****.* (В.Гігевіч); *І* ***слоў*** *бразготных* ***вадаспад*** *Пакіне раптам раўнадушным.* (Н.Гальпяровіч); *Яраслаў сыпнуў чарговы* ***каскад пытанняў****, але мы не маглі слухаць адказаў.* (І.Дуброўскі).

Гукавыя метафары часам утвараюцца ад найменняў музычных інструментаў. У гэтых выпадках праводзіцца паралель паміж гучаннем музычных інструментаў і гукамі, утваральнікамі якіх з'яўляюцца дрэвы, расліны, вецер, бура, завіруха, дождж, рэчка, ручай, птушкі, насякомыя, артэфакты і інш. У працэс метафарызацыі ўключаюцца першасныя ЛСВ субстантываў *гуслі, цымбалы, жалейка, скрыпка, арган, флейта, бубен, кантрабас, гармонік, дуда, смык: Доўга лес на* ***гуслях*** *граў зялёных* (М.Танк); *Зайгралі на мілі вятрыскавы* ***гуслі****.* (А.Вялюгін); *Ты тут вандроўнік, лірнік і ратай, і можаш на* ***цымбалах буры*** *граць.* (Д.Бічэль-Загнетава); *Зарою весняй празвіні, мой край, На* ***ручайкоў цымбалах*** *заіграй.* (М.Віняцкі); *Ледзь кратаў лёгкі вецер* ***Цымбалы*** *звонкіх* ***ніў****.* (М.Лужанін); *Вы чуеце, як па* ***цымбалах*** *крыніц вясёлых Скачуць цуркі, вылітыя з прамення, І жменямі сыплюць гукі на дол і каменне?* (П.Марціновіч); *Час для роздуму – вечар позні. Чула мама* ***жалейку*** *квецені. Чуе мама* ***жалейку*** *пожні.*(А.Емяльянаў); *Зноў вецер зайграў на* ***жалейках*** *саломы.* (С.Законнікаў); *А можа чуць вам*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*давялося, Як грае ноч на* ***скрыпках сосен*** *Смычкамі восеньскіх вятроў?* (П.Броўка); *Вецер на* ***скрыпках сосен*** *іграў.* (А.Бачыла); ***Скрыпка*** *начнога* ***дажджу*** *цешыць старыя тапалі.* (Т.Лапцёнак); *Ціхай* ***скрыпкай*** *заіграе польны вецер.* (М.Танк); *Пад гукі* ***скрыпак конікаў*** *Танцуюць матылькі.* (А.Сербантовіч); *Будзе ў песні чутно селяніна Ды ў* ***скрыпках сахі і сярпа****.* (А.Гурло); *Шумелі тут вяршыні баравыя, Ствол да ствала –гудзеў лясны* ***арган****.* (А.Куляшоў); *Лесу* ***арган*** *ахрып.* (Л.Філімонава); *Пералівам* ***флейты****-крыніцы Альшанік пяе без устанку.* (П.Пестрак); *Цішыню трансліруюць сосны,* ***Флейта*** *івалгі сонечна грае.* (А.Русецкі); *У срэбны* ***бубен*** *б'юць сініцы, На* ***флейтах*** *свішчуць снегіры.* (В.Вітка); *На* ***кантрабасах дрэў****, на* ***флейтах*** *завірухі Такі канцэрт наладзілі вятры, Што нават снег, каб рэквіем паслухаць, Як белы слуп, насіўся угары.* (А.Сербантовіч); *І сосны на* ***скрыпках*** *зайгралі ў адказ, І дуб адгукнуўся – лясны* ***кантрабас****.* (Э.Агняцвет); *Вы чуеце, як зялёны* ***гармонік*** *гаю Расцягвае вецер разгублена і адзінотна.* (П.Марціновіч); *Дубы-дзяды імшэлыя – ледзь золак, і яны На* ***дудах*** *перагукваюцца з* ***гуслямі вясны****.* (А.Александровіч); *Галосіць пад вострым* ***смыком*** *палазоў Тугой безнадзейнай сцяжыны струна.* (М.Танк).

Некаторыя маўленчыя метафары арыентаваны на выяўленне спецыфікі маўлення з улікам яго сэнсавай напоўненасці, сілы і моцы ўздзеяння, пэўнай скіраванасці да адрасата. Параўн.: *І чарсцвее душа ад* ***карозіі*** *безадказных, бяздумных* ***слоў****.* (В.Вітка); *Усюды восеньская стомленасць і* ***слоў азяблы лістапад****.* (М.Баравік); *Пачынай выплаўляць* ***слоў трывожную медзь****.* (У.Верамейчык); *А трэба мне ў жыцця няшмат: Спакой душы,* ***бунтарства слова****, Свой далягляд і твой пагляд Вачэй зялёных, як замова.* (А.Салтук); *Ты год вяртаешся назад У безнадзейнасць, асцярожна, І ў вечаровасці астрожнай Ссыпаеш* ***словаў колкі град****.* (В.Куртаніч); *І што тут зробіць нават бог, Хоць і зрабіць захоча, Калі* ***каменных слоў гарох****, Як ад сцяны, адскоча!* (А.Сербантовіч); *Бясконцыя сходы, і пахне час адсутнасцю зла ў* ***пене пульхных фраз****.* (П.Шруб); *Быў* ***свінец*** *непатрэбных слоў,* ***Кананада*** *бязладных* ***гукаў****.* (С.Сокалаў-Воюш).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ